ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

# ЧЫРВОНАЯ ЗВЯЗДА

Орган Косаўскага РК КП(б) Беларусі і Выканкома Райсовета дэпутатаў працоўных.

№ 8 Чацвер, 12 Кастрычіка 1944 г.

**ВОЙСКІ 2-га УКРАІНСКАГА ФРОНТА, РАЗВІВАЮЧЫ НАСТУПЛЕННЕ, 11 КАСТРЫЧНІКА ШТУРМАМ АВАЛОДАЛІ СТАЛІЦАЙ ТРАНСІЛЬВАНІІ БУЙНЫМ ПРАМЫСЛОВЫМ ЦЭНТРАМ ГОРАДАМ КЛУЖ І, ФАРСІРАВАЎШЫ РАКУ ЦІСА, АВАЛОДАЛІ ДРУГІМ ПА ВЯЛІЧЫНІ ВЕНГЕРСКІМ ГОРАДАМ І ВАЖНЫМ ПАЛІТЫЧНЫМ ЦЭНТРАМ СІГЕД.**

## АКТЫВІСТЫ— АРГАНІЗАТАРЫ МАС

Любішчыцкі сельсовет выканаў план па здачы хлеба дзяржаве. Падыходзіць да заканчэння выкананне плана бульбы. Сяляне сельсовета з вялікім уздымам сустракаюць кожнае мерапрыемства партыі і ўрада і стараюцца выканаць яго чым хутчэй.

Ва ўсёй сваёй рабоце сельсовет абапіраецца на шырокі актыў. Лепшыя сяляне, былыя партызаны, Брыль Сцяпан, Молаш Васіль, Макар Грыгорый, з'яўляюцца не толькі лепшымі актывістамі, а перадавымі хлебаздатчыкамі. Яны вядуць за сабой усю масу сялян сельсовета. Так Молаш Васіль, не гледзячы на тое, што немцы абрабавалі яго гаспадарку, першым разлічыўся з дзяржавай па здачы хлеба і бульбы і здаў у фонд абароны краіны 10 пудоў добраякаснага збожжа. Рыгор Макар перавыканаў план пастаўкі збожжа на 200 кг. поўнасцю здаў бульбу ў лік абавязацельства.

Дэпутат сельсовета партызан Брыль Сцяпан не пакладаючы рук змагаецца за выкананне дзяржаўнага плана паставак. За ім замацован участак у 50 гаспадарак, пры тым раскіданых на значнай тэрыторыі. Т. Брыль паставіў работу так што ўчастак датэрмінова выканаў збожжапастаўкі і паўтары тоны добраякаснага збожжа здаў у фонд абароны.

Зараз у сельсовеце поўным ходам ідзе абмалот збожжа, пакінутага нямецкімі прыхваснямі. Гэта работа прыбліжаецца да заканчэння. Дзяржава атрымае звыш 20 тон добраякаснага збожжа.

**Паулоускі**
старшыня сельсовета

### АЛЬБІНСКІ І СТАЙКАЎСКІ СЕЛЬСОВЕТЫ ВЫКАНАЛІ ПЛАН ПАСТАВАК ХЛЕБА ДЗЯРЖАВЕ.

Сяляне і сялянкі, следуйце патрыятычнаму прыклад, перадавікоў! Шырэй соцыялістычнае спаборніцтва за хутчэйшае выкананне паставак хлеба і бульбы!

## ДЛЯ ПЕРАМОГІ НАД ВОРАГАМ— БОЛЬШ ХЛЕБА!

## Пастанова

**Выканкома Косаускага райсовета дэпутатау працоуных і РК КП(б)Б ад 10 кастрычніка 1944 г.**

**АБ ЗАНЯСЕННІ НА РАЁННУЮ ДОШКУ ПАЧОТА АЛЬБІНСКАГА, І СТАЙКАУСКАГА СЕЛЬСОВЕТАУ.**

Выканком Косаўскага райсовета дэпутатаў працоўных і РК КП(б)Б пастанаўляюць:

Занесці на раённую дошку пачота Альбінскі сельсовет (старшыня сельсовета т ЦЕРЭШКА), які поўнасцю выканаў дзяржаўны план паставак хлеба, закончыў абмалот і здачу хлеба з безгаспадарчых пасеваў. Стайкаўскі сельсовет (старшыня сельсовета т. КУЛЕЦКІ), які поўнасцю выкаваў план дзяржаўных паставак хлеба, перавыканаў план здачы збожжа з безгаспадарчых пасеваў.

Старшыня Косаўскага райсовета дэпутатаў працоўных МАНАХАЎ.
Сакратар РК КП(б)Б КАВАЛЁЎ.

## РАЕННАЯ ДОШКА ПАЧОТА

Пастановай райвыканкома і РК КП(б)Б занесены на раённую дошку пачота наступныя сельсоветы:

**1. Альбінскі** (старшыня сельсовета т. **Церэшка**), які поўнасцю выканаў дзяржаўны план паставак хлеба, закончыў абмалот і здачу хлеба з безгаспадарчых пасеваў.

**2. Стайкаускі** (старшыня сельсовета т. **Кулецкі**), які поўнасцю выканаў план дзяржаўных паставак хлеба, перавыканаў план здачы збожжа з безгаспадарчых пасеваў.

## У ПАДСТАРЫНІ ДРЭННА КІРУЮЦЬ ПАСТАУКАМІ ХЛЕБА І БУЛЬБЫ

Падстарынь — партызанская вёска. У перыяд нямецкай акупацыі яна аказвала значную дапамогу партызанскім атрадам прадуктамі харчавання, узбраеннем. Яна дала ў іх рады такіх слаўных змагароў за шчасце народнае як камісар брыгады Талочка Канстанцін Дзем'янавіч, Васілевіч Александр, Мікуліч Васіль Рыгоравіч і др.

Нямецкія акупанты і іх прыхвасні—паліцайскія ўвесь час пагражалі Падстарыні расправай. Яны расстралялі селяніна Нікалайчыка Максіма і яго ўнука, селяніна Васілевіча Грыгорыя, яго маці і сястру, поўнасцю знішчылі сям'ю Касаўца Васіля Якаўлевіча, а хату і ўсе другія будынкі спалілі. Многа юнакоў і дзяўчат угнана на нямецкую катаргу.

Сяляне Падстарыньскага сельсовета з радасцю сустрэлі сваю вызваліцельніцу—Чырвоную Армію. Ужо з першых дзён вызвалення яны ўзяліся залечваць раны, нанесеныя акупацыяй. Яны актыўна ўключыліся ў аднаўленчую працу, дапамагаюць фронту ўсім, чым толькі можна. У фонд абароны здадзена звыш паўтары тоны хлеба.

Чым-жа вытлумачыць, што сельсовет марудна выконвае план здачы хлеба і бульбы дзяржаве?

Трэба сказаць прама, што кіраўнікі сельсовета з першых дзён сваёй дзейнасці не сумелі арганізаваць вакол сельсовета шырокі сялянскі актыў, не папулярызавалі прыклады перадавых сялян і пусцілі важнейшае дзяржаўнае мерапрыемства—выкананне дзяржаўных паставак—на самацёк.

Падстарыньскі сельсовет складаецца з двух вёсак: Падстарыні і Борак. Тут, як нідзе, павінна ажыццяўляцца штодзённае кіраўніцтва сельсовета і яго упаўнаважаных. Але старшыня сельсовета т. Снітко і сакратар т. Гулевіч не жадаюць працаваць так як трэба. Яны ўсе спадзяюцца, што за іх будуць працаваць упаўнаважаныя раённых арганізацый.

Яркім фактам непаваротлівасці кіраўнікоў сельсовета служыць неарганізаванасць у прыёме бульбы. 8-Х г. г. многія бясконныя сяляне падрыхтавалі да здачы бульбу. Але сельсовет не паклапаціўся арганізаваць фурманкі для падвоза яе на прыёмны пункт. У выніку, аўтамашына, якая забірала бульбу з прыёмнага пункта рабіла значныя прастоі.

Прадстарыньскі сельсовет мае ўсе магчымасці быць перадавым сельсоветам ва ўсіх адносінах. Тут ёсць выдатныя людзі, перадавыя хлебаздатчыкі як Макарэвіч Іван, Букшта Сцяпан, Семянюк Александр, Лапчук Елізавета, якія ужо поўнасцю выканалі абавязацельствы па здачы хлеба і бульбы.

Кіраўнікам сельсовета трэба прыблізіць гэтых людзей да сябе, стварыць з іх актыў і апірацца на яго ва ўсёй рабоце. Тады справы пойдуць зусім інакш.

## Прамысловыя вырабы Касаўскага райпромкамбіната

За кароткі час свайго існавання Райпромкамбінат прарабіў значную работу ў області вырабу рэчаў шырокага ўжывання.

І вось прышла пара паказаць сваё дасягненні. Абласная выстаўка прамысловых вырабаў райпромкамбінатаў з'явілася люстрам, у якім адбіваецца ўся многагранная творчая работа мясцовай прамысловасці.

Косаўскі Райпромкамбінат даставіў на выстаўку рэчы, зробленыя у 15 дробных прадпрыемствах. Слясарная майстэрня прадстаўлена па майстэрскі зробленымі кранцыркулем, унутрамерам, цыркулем, унутраным замком. Кузнечныя вырабы прадстаўлены падковамі, кухоннымі віламі, нажамі, секачом і другімі.

Характэрна, што на выстаўку папала першая прадукцыя маслабойнага цэха, ліцейнага цэха, бетоннага цэха. Гэтыя маленькія цэхі яшчэ толькі пачынаюць сваю дзейнасць, але з ходам іх развіцця яны будуць прыносіць вялікую карысць.

Партыя і ўрад удзяляюць вялікую ўвагу развіццю мясцовай прамысловасці і асабліва ў раёнах вызваленых ад нямецкай акупацыі. Мы маем магчымасць вырабляць усе неабходныя рэчы на месцы. Дырэкцыі Райпромкамбіната трэба яшчэ шырэй разгортваць сетку дробных прадпрыемстваў па выпуску неабходных для насельніцтва вырабаў.

А. Каліна

## НЕКАЛЬКІ СЛОЎ АБ АРГАНІЗАЦЫІ БАЗАРА

Чым вытлумачыць такое становішча, што ў Косаве да гэтага часу няма базара?

Сяляне не раз ужо рабілі спробу прывозіць і прыносіць прадукты ў горад для продажы. Але дзе з імі спыніцца, яны не ведаюць. У выніку многія сялянкі носяць прадукты проста па кватэрах, шукаючы пакупніка.

Ні Горсовет, ні раённыя гандлёвыя арганізацыі не паклапаціліся, каб устанавіць месца базара, абсталяваць яго неабходным абарудаваннем. У гэтым уся прычына. А цярпець яе далей немагчыма.

У Косаве павінен быць узорны базар. У гэтым павінны быць заінтарасованы партыйныя совецкія і гандлёвыя арганізацыі.

## У пасялковым клубе

Аднавіў сваю работу клуб у гарадскім пасёлку Івацэвічы. У ім ужо прачытана 2 лекцыі для працоўных пасёлка.

Зараз пры клубе арганізуецца мастацкая самадзейнасць. Сіламі комсамольскай арганізацыі (комсорг Лаўрэнчык) рыхтуецца п'еса, якая будзе пастаўлена ў дзень 27 гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі.

В.а. Рэдактара А. П. РУДОЙ.

Адрас рэдакцыі: Косаў, вул. Максіма Горкага 106.